# Правілы ўдзелу і прынцыпы
# фестывальнай прасторы PRADMOVA

PRADMOVA — гэта прастора беларускай культуры, кнігі, ідэй і сустрэч. Мы разумеем гэты фестываль як месца, дзе сустракаюцца розныя людзі, погляды і досведы. Менавіта гэтая разнастайнасць робіць культурныя сустрэчы важнымі і жывымі.

Мы імкнёмся ствараць адкрытае, бяспечнае і прыязнае асяроддзе для ўсіх: удзельнікаў/ўдзельніц праграмы, гасцей, наведнікаў/наведніц, партнёраў/партнёрак, валанцёраў/валанцёрак і каманды фестывалю.

Гэтыя правілы патрэбныя не для абмежавання творчасці, дыскусіі або свабоды выказвання. Яны дапамагаюць нам разам ствараць прастору, у якой кожны чалавек можа адчуваць сябе паважаным, пачутым і ў бяспецы.

## 1. Павага і бяспека фестывальнай прасторы

PRADMOVA падтрымлівае адкрыты дыялог, свабоду выказвання і плюралізм меркаванняў. Мы не патрабуем ад удзельнікаў/удзельніц аднолькавых поглядаў і вітаем крытычныя пытанні, аргументаваныя меркаванні і розныя пункты гледжання.

Мы разумеем, што культурная прастора можа ўключаць складаныя тэмы і розныя думкі. Наяўнасць адрозных поглядаў не з'яўляецца падставай для асабістых нападаў, пераследу або прыніжэння іншых людзей.

Пры гэтым мы чакаем, што любая размова і дыскусія будуць будавацца на ўзаемнай павазе.

Мы не падтрымліваем і не дапускаем паводзіны, якія ствараюць небяспечную або варожую атмасферу для іншых людзей.

Да такіх паводзін адносяцца:

- пагрозы і агрэсія;
- пераслед, непажаданая ўвага або парушэнне асабістых межаў;
- абразы і прыніжэнне чалавека або групы людзей;
- дыскрымінацыя па прыкметах полу, узросту, нацыянальнасці, расы, мовы, рэлігіі, стану здароўя, сэксуальнай арыентацыі, гендарнай ідэнтычнасці, сацыяльнага становішча або іншых асабістых характарыстык;
- выкарыстанне мовы варожасці;
- прапаганда вайны і гвалту.

Мы таксама просім не ствараць сітуацый, калі ўжыванне алкаголю, знаходжанне ў стане моцнага ап'янення або іншыя паводзіны перашкаджаюць бяспецы і камфорту іншых удзельнікаў/удзельніц фестывалю. Гэта дае арганізатарам фестывалю права папрасіць чалавека пакінуць пляцоўку.

Калі чалавек сутыкаецца з такімі сітуацыямі, ён ці яна могуць звярнуцца да арганізатараў або валанцёраў/валанцёрак фестывалю.

## 2. Удзел у мерапрыемствах і дыскусіях

Мы просім наведнікаў/наведніц і ўдзельнікаў/удзельніц:

- паважаць час і працу выступоўцаў, мадэратараў/мадэратарак і іншых гасцей;
- прытрымлівацца фармату канкрэтнага мерапрыемства;
- не перашкаджаць правядзенню сустрэч;
- задаваць пытанні і выказваць меркаванні ў форме, якая дазваляе весці адкрыты і паважлівы дыялог.

Мадэратары/мадэраткі і куратары/куратаркі мерапрыемстваў могуць умешвацца ў ход размовы, калі гэта неабходна для захавання таймінгу, тэмы або бяспечнай атмасферы. Мадэратар/мадэратарка можа спыніць выступ, пытанні або рэпліку, калі яны парушаюць правілы бяспекі, пераходзяць у асабісты напад або не адпавядаюць тэме мерапрыемства.

## 3. Камунікацыя з камандай і валанцёрамі

Каманда PRADMOVA і валанцёры/валанцёркі робяць усё магчымае, каб фестываль адбыўся якасна і камфортна для ўсіх удзельнікаў/удзельніц.

Просім з павагай ставіцца да іх працы, выконваць арганізацыйныя просьбы і звяртацца па дапамогу ў выпадку неабходнасці.

Валанцёры/валанцёркі часта з'яўляюцца першымі людзьмі, да якіх наведнікі/наведніцы звяртаюцца па дапамогу. Яны ўдзельнічаюць у фестывалі на грамадскіх пачатках і дапамагаюць ствараць агульную прастору сустрэчы.

На пляцоўцы арганізатараў/арганізатарак і валанцёраў/валанцёрак PRADMOVA можна пазнаць па спецыяльных бейджах.

Калі ў наведніка/наведніцы ёсць заўвагі, прапановы або складанасці, мы заахвочваем паведамляць пра іх непасрэдна арганізатарам. Па пытаннях, звязаных з удзелам у фестывалі, можна таксама звяртацца праз электронную пошту: pradmova@gmail.com ці zayaukipradmova@gmail.com.

**4. Фота-, відэа- і медыйныя матэрыялы**

Падчас мерапрыемстваў PRADMOVA могуць праводзіцца фота- і відэаздымка, а таксама трансляцыі і запісы для далейшага выкарыстання ў медыяканалах фестывалю.

Матэрыялы могуць выкарыстоўвацца для справаздачнасці, архівавання, папулярызацыі фестывалю і распаўсюду інфармацыі пра яго дзейнасць.

Калі чалавек не хоча трапляць у публічныя фота- або відэаматэрыялы, ён ці яна могуць паведаміць пра гэта арганізатарам. Падчас мерапрыемстваў можна скарыстацца адмысловай налепкай «Не фатаграфаваць», якая дапамагае фатографам/фатографкам і камандзе фестывалю пазначыць людзей, якія не жадаюць трапляць у публічныя матэрыялы.

Калі чалавек не пазначае сваё пажаданне такой налепкай або не паведамляе арганізатарам, каманда фестывалю можа не ведаць пра неабходнасць абмежаваць выкарыстанне яго/яе выявы.

Арганізатары PRADMOVA не могуць цалкам кантраляваць здымку, якую самастойна ажыццяўляюць наведнікі/наведніцы або трэція асобы падчас адкрытых мерапрыемстваў

**5. Інклюзія і даступнасць**

PRADMOVA імкнецца быць адкрытым для розных груп людзей і ўлічваць розныя патрэбы ўдзельнікаў/удзельніц і наведнікаў/наведніц.

Мы асабліва імкнёмся даць прастору выказвання тым людзям, тэмам і супольнасцям, якія часта недастаткова прадстаўленыя ў культурнай прасторы.

Мы стараемся ствараць умовы, у якіх могуць удзельнічаць людзі рознага ўзросту, паходжання, досведу і магчымасцяў.

Калі чалавеку патрэбная дадатковая падтрымка для ўдзелу ў мерапрыемстве, просім паведаміць арганізатарам загадзя — мы пастараемся знайсці адпаведнае рашэнне.

Калі вам патрэбная інфармацыя пра даступнасць канкрэтнай пляцоўкі або асаблівыя ўмовы ўдзелу, калі ласка, звярніцеся да арганізатараў загадзя праз пошту pradmova@gmail.com ці zayaukipradmova@gmail.com.

**6. Удзел дзяцей і падлеткаў**

На мерапрыемствах PRADMOVA могуць прысутнічаць дзеці і падлеткі (калі ў праграме не пазначаны адмысловы ўзроставы цэнз).

Мы просім дарослых наведнікаў/наведніц улічваць іх прысутнасць і дапамагаць ствараць бяспечную і добразычлівую атмасферу для людзей розных пакаленняў.

### 7. Беражлівыя адносіны да прасторы

Просім беражліва ставіцца да пляцовак, на якіх праходзяць мерапрыемствы PRADMOVA, а таксама да кніг, абсталявання, дэкарацый і іншых рэчаў, якія выкарыстоўваюцца падчас фестывалю.

Клопат пра агульную прастору — гэта частка нашай супольнай адказнасці.

### 8. Камерцыйная дзейнасць і хатнія жывёлы

PRADMOVA падтрымлівае кніжныя і культурныя ініцыятывы, аднак продаж кніг, мерчу або іншых тавараў падчас фестывалю магчымы толькі ў фарматах, узгодненых з арганізатарамі.

Прысутнасць хатніх жывёл на пляцоўках фестывалю магчымая пры ўмове, што гэта не стварае нязручнасцяў або небяспекі для іншых наведнікаў/наведніц, а таксама калі гэта адпавядае правілам партнёрскай пляцоўкі.

### 9. Калі ўзнікаюць складанасці

Калі ўзнікае сітуацыя, якая парушае бяспеку або камфорт іншых удзельнікаў/удзельніц, арганізатары PRADMOVA імкнуцца спачатку вырашыць яе праз размову і пошук рашэння.

У выпадку сур'ёзных або паўторных парушэнняў арганізатары могуць папрасіць чалавека пакінуць пляцоўку або адмовіць ва ўдзеле ў асобных мерапрыемствах.

### 10. Заключэнне

PRADMOVA — гэта супольнасць людзей, аб'яднаных цікавасцю да беларускай культуры, кнігі і свабоднага абмену ідэямі.

Мы дзякуем усім удзельнікам/удзельніцам і наведнікам/наведніцам за дапамогу ў стварэнні прасторы, дзе можна сустракацца, размаўляць, спрачацца, вучыцца і разам развіваць беларускую культуру.

Гэтыя правілы — не толькі пра абмежаванні, але і пра нашу агульную дамоўленасць: ставіцца адно да аднаго з павагай і клапаціцца пра прастору, якую мы ствараем разам.